теринбург, Омск). Это позволяет сделать вывод об имеющемся интересе к проблеме функционирования органов военной юстиции в регионах России на обозначенном отрезке ее истории в региональных научных и образовательных центрах российской исторической науки.

**Список использованных источников**

1. Официальный сайт Российской государственной библиотеки: Единый электронный каталог [Электронный ресурс]. – М.: РГБ, 1999–2018. – Режим доступа: https://search.rsl.ru/ru/search. – Дата доступа: 15.12.2018.
2. *Гвардиян, С. А.* Современные исследования по военной истории России XIX – начала XX веков: региональный аспект / С. А. Гвардиян // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск: РИВШ, 2017. – Вып. 1. – С. 156–165.
3. *Марыскин, А. В.* Судебная реформа 1864 года и особенности ее проведения на территории Белоруссии: автореф. дис. … канд. юрид. наук: 12.00.01 / А. В. Марыскин. – М., 1985.
4. *Адамюк, О. И.* Военная юстиция Республики Беларусь как предмет исследования военно-юридической науки: современное состояние и перспективы развития / О. И . Адамюк // Право.by. – 2009. – № 3. – С. 14–21.
5. *Шимукович, С. Ф.* Современная российская историческая наука об элитах «Долгого XIX века» / С. Ф. Шимукович // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. статей: в 3 ч. – Минск: РИВШ, 2018. – Вып. 18, ч. 1 − С. 418–425.

**(Дата подачи: 28.02.2019 г.)**

*А. В. Перзашкевіч*
дацэнт кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў БДУ, Мінск

*A. Perzashkevich*
Associate Professor of the Chair for the History of Ancient World and Middle Ages, BSU

**УДК 94(34)**

# РЫГВЕДЫЙСКАЕ ГРАМАДСТВА І ГІСТОРЫЯ (КЛАСІЧНАЯ ІНДЫЙСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ)

# RIGVEDIC SOCIETY AND HISTORY (THE CLASSICAL INDIAN TRADITION)

*Адной з ключавых гістарычных праблем грамадства, адлюстраванага ў Рыгведзе, з’яўляецца поўная адсутнасць для яго бясспрэчнай абсалютнай храналогіі. Падлікі, прыведзеныя ў сутрах Ар’ябхаты і Варахаміхіры, паказваюць час пачатку каліюгі і вайны Махабхараты. Усе сучасныя даследчыкі сыходзяцца на тым, што рыгведыйскае грамадства існавала раней часу вайны Махабхараты. Але пураны сцвярджаюць, што вайна прыйшлася на пачатак калі-югі, г. з. у канцы IV тыс. да н. э., што не адпавядае пануючай храналогіі гісторыі Старажытнай Індыі. Артыкул разглядае асноўныя*

*індыйскія крыніцы, якія тычацца паказаных падзей, і суадносіць іх з дадзенымі аль-Біруні і Махавамшы. У выніку перыяд існавання рыгведыйскага грамадства вызначаецца як XXXXI –XXXII стст. да н. э.*

*Ключавыя словы: рыгведыйскае грамадства, храналогія, пураны, сутры, эпоха Рыгведы, вайна Махабхараты, каліюга.*

*One of the major historical problems of the society, depicted in the Rigveda, is the absence of any evident absolute chronology. The computations of sutras by Aryabhata and Varahamihira show the time of Kali-yuga and Mahabharata war. All modern researches indicate that the Rigvedic situation used to be real before that war. However, the Puranas also testify, that the war had been started in the beginning of Kali-yuga (c. late IV millennium BC), which does not match the mainstream chronology of Ancient India. The article reviews the principle ancient Indian sources for all those key-points and correlates them altogether and with the dates, put out by al-Biruni and Mahavamsa. As the result, he proposes the time period of XXXXI - XXXII centuries BC for the age of Rigvedic society, which is consistent with the mentioned sources.*

*Key words: Rigvedic society, chronology, puranas, sutras, age of Rigveda, Mahabharata war, Kali-yuga.*

Праблема ўсталявання абсалютнай храналогіі ведыйскага грамадства і, у тым ліку, самага старажытнага з іх, рыгведыйскага, з'яўляецца адной з самых істотных у гістарычнай індалогіі. Разам з тым, самі помнікі, як вядома, не ўтрымоўваюць ніякіх бясспрэчных храналагічных звестак. Менавіта таму пытанні датавання Ведаў заўсёды выклікалі вялікую цікавасць і дыскусіі.

У наш час у якасці найболей распаўсюджаных храналогій выступаюць тры. Па-першае, гэта даты, заснаваныя на індыйскай традыцыі сутр; па-другое, вылічэнні па дадзеных пуран; па-трэцяе, гэта сістэма датавання, прапанаваная еўрапейскімі навукоўцамі XIX у., і ў першую чаргу, Ф. Макс-Мюлерам [1, с. 572].

Як відаць, сярод іх няма варыянтаў, заснаваных пераважна на археалагічных дадзеных. Нажаль, дадзеныя археалогіі і на сённяшні дзень не могуць быць скарыстаны для ўсталявання якіх-небудзь надзейных храналагічных адпаведнасцяў у Рыгведзе, у першую чаргу, у сілу сваёй крайняй неадназначнасці [гл. 2, с. 434; 3, с. 28–40].

У сапраўднай працы гаворка пойдзе пра датаванне рыгведыйскага грамадства на аснове традыцыйных індыйскіх падыходаў, гэта значыць па дадзеных сутр і пуран.

Датаванне існавання грамадства, апісанага ў Рыгведзе, заснаванае на сутрах, першым чынам Ар'ябхаты і Варахаміхіры, зыходзяць з таго, што Веды склаліся да таго, як наступіла каліюга, і пачалася апісаная ў Махабхараце вайна (кульмінацыяй гэтай вайны стала знакамітая бітва пры Курукшэтры).

Паводле падлікаў аль-Біруні па ўказаннях Брахмагупты, каліюга выдаленая ад часу напісання яго «Індыі» на 4132 г. (Індыя, XLIX) [тут і далей указанні даюцца па 4], г. з. датуецца 3102 г. да н. э. [5, с. 14; 6, с. 646]. Характэрна, што сам аль-Біруні, па нейкім чынніку, не злучаў пачатак каліюгі з вайной Махабхараты. З прычыны гэтага сярэдневяковы навуковец вызначаў,

што эпоха вайны, пазначаная ім як пандава-кала (Індыя, XLIX), адбылася на 653 г. пазней – у 2449 г. да н. э. Гэта дата была, верагодна, вылічана па ўказаннях старажытнаіндыйскага астранома Варахаміхіры. Той, у сваёй Брыхатсамхіце, запісаў, што валадаранне Юдхіштхіры пачалося за 2526 гадоў да пачатку эры Шака (zakakAla) (BrS 13, 3). Індыйская традыцыя лічыць вайну Махабхараты пачаткам каліюгі. Але 653 гады – гэта занадта працяглы тэрмін для таго, каб лічыць гэты час пераходным перыядам, гэта значыць часам жыцця Крышны, пры якім каліюга не выяўлялася (напрыклад, VP IV 24, 109) [тут і далей указанні даюцца па 5]. Не дзіўна, што гэтае разыходжанне праціўнікамі традыцыйнай храналогіі паказваецца як сведчанне яе безгрунтоўнасці.

Варта, тым не менш, заўважыць, што паказанае разыходжанне з’яўляецца, верагодна, не гэтулькі супярэчнасцю паміж Ар’ябхатай і Варахаміхірай, колькі вызначэннем эры ва ўказаннях Варахаміхіры самім іранскім сярэдневяковым аўтарам ці яго інфарматарамі. Аль-Біруні атоесніў гэта ўказанне з вядомай эрай шакскіх сатрапаў у Індыі (78 –338 гг. н. э.), паколькі менавіта яна ў часы аль-Біруні звалася "шака-калай".

Справа ў тым, што індыйскі аўтар спасылаўся ў дадзеным выпадку на больш ранняга аўтара Гаргу (VI ст. да н. э. [8, с. 170]), для якога шака-кала не магла пазначаць час пачатку кіравання згаданых сатрапаў. Гаворка можа ісці толькі пра больш ранняе існаванне «шака» (дынастыі іранскага паходжання ў індыйскай традыцыі) (што зрэшты, дакладна і для Варахаміхіры). Такім чынам, падыходзіць, напрыклад, кіраванне Кіра II Ахеменіда (550–529 гг. да н. э.), ці заваёўніка абласцей па Інду Дарыя I Ахеменіда (522–486 гг. да н. э.), ці нават заснавальніка той дынастыі Шак’яў, да якой прыналежаў Гаутама Сіддхартха.

У першым выпадку, пачатак пандава-калы даводзілася б на 3076 г. да н. э. [9, с. 55], у другім – на 3048 г. да н. э., а ў трэцім – у залежнасці ад таго, як датаваць пачатак кіравання паказаных Шак’яў. Калі, напрыклад, датаваць яго ад нараджэння Сіддхартхі Гаутамы (к. 560 г. да н. э.), то атрымаем 3086 г. да н. э. Тым не менш, нават 2449 г. да н. э. можа задавальняць умовам, паколькі, паводле традыцыі, наступ каліюгі у поўную сілу пачалося пасля таго, як на прастол узышоў Махападма, заснавальнік папярэдняй Маур’ям дынастыі Нанда (напрыклад, VP IV 24, 112).

На вызначэнні часу наступу каліюгі і падзей вайны Махабхараты пабудаваная і храналогія, заснаваная на дадзеных пуран. Як вядома, пураны ўтрымоўваюць спісы кіраўнікоў апісваных у іх тэрыторый, а для некаторых дынастый даюць таксама і гады іх кіравання. Хоць і самі спісы, і працягласць царавання адрозніваюцца ў залежнасці ад пураны, некаторыя заканамернасці і інтэрвалы паддаюцца вызначэнню.

Першым чынам, гэта паслядоўнасць і працягласць кіраванняў дынастый пасля бітвы пры Курукшэтры. Пасля гібелі ў бітве Сахадэвы, на простол у Магадхе ўзышла дынастыя Бархадратха, якая кіравала (у залежнасці ад

пураны) каля 1000 гадоў. Яе змяніла дынастыя Прад'ёта, якая кіравала каля 150 гадоў. За ёй каля 350 гадоў гаспадарылі Шышунагі, якіх і змянілі Нанды. Такім чынам, адбылося гэта праз, прыкладна, 1500 гадоў. Нанды царавалі каля 100 гадоў і саступілі трон Чандрагупту Маур'я. Такім чынам, Чандрагупта прыйшоў да ўлады, прыкладна, праз 1600 гадоў пасля гібелі Сахадэвы пры Курукшэтры. Маур'я кіравалі каля 135 гадоў, затым на пасадзе каля 110 гадоў былі Шунга, але, як вядома, кіравалі паралельна з іншымі дынастыямі, наймацнейшай з якіх першапачаткова была Андхра. Гэты паралелізм, дарэчы сказаць, меў месца і ў папярэднія перыяды, што вынікае з сінхранізацыі пуранамі кіраўнікоў розных дынастый старажытнасці (у нашым выпадку гэта не істотна) [10, с. 67–69]. Адзначым толькі, што адлік бітвы пры Курукшэтры ад кіравання Ашокі Маур'я (гэта значыць, мяркуючы па палійскіх хроніках і надпісах самога цара, у III ст. да н. э.), дае нам XX ст. да н. э.

Пры ўсёй, здавалася б, відавочнасці такіх падлікаў, менавіта супраць іх і пярэчыць сам найславуты даследчык пуран Ф. Э. Паргітэр у сваёй «Старажытнаіндыйскай гістарычнай традыцыі», прапануючы, замест паказаных у пуранах тэрмінаў кіравання, разлікі, заснаваныя на ўласных абстрактных пабудовах. Галоўнае, з чым не згодны ўзгаданы даследчык, – агульная працягласць перыяду. У выніку ўласных падлікаў ў яго атрымліваецца, што бітву пры Курукшэтры варта датаваць не XX, а X ст. да н. э., адводзячы на, прынамсі, 34 паказаных пакаленні кіраўнікой (ад Самадхі да Чандрагупты, лічачы за адно пакаленне двух цароў пры змене дынастый) 630 гадоў, гэта значыць меней 19 гадоў [11, с. 179–182].

Зыходзячы з такога меркавання выдатнага даследчыка, прапануем, для параўнання, стандартныя падлікі, заснаваныя на вылічэнні пакаленняў з інтэрваламі 20 гадоў і 40 гадоў. Атрымаем, што паміж Сахадэвай, што загінуў у бітве пры Курукшэтры, і ўзыходжаннем Чандрагупты Маур'і прайшло ад 680 да 1360 гадоў, што дае нам інтэрвал X–XVII стст. да н. э. Але, пры гэтым, варта зноў улічыць заўвагу самога Ф. Э. Паргітэра, што асобныя кіраўнікі прапускаліся паводле традыцыі [11, с. 89, 183]. Са сказанага выходзіць, што X ст. да н. э. ці наўрад можа быць прыняты да ўвагі, як не можа быць бясспрэчна прынятае і XX ст. да н. э.

Яшчэ адзін інтэрвал можа быць усталяваны паміж бітвай пры Курукшэтры і ўзыходжаннем у Айодхе Шак'я, сынам якога (паводле звестак некаторых пуран) з'яўляўся Суддхадана, а ўнукам – Сіддхартха, у якім часам бачаць Сіддхартху Гаутаму (Буду), сучасніка Бімбісары Шышунагі [9, с. 71–77]. Шак'я быў 22 пакаленнем цароў, нашчадкаў Брыхадбалы, што загінуў пры Курукшэтры. З інтэрвалам у 20 гадоў на пакаленне маем 440 гадоў да ўзыходжання, у 40 – 880 гадоў. Атрымліваецца, што гэты Шакья ніяк не мог пакласці пачатак шака-калы, паколькі гэта азначала б, што кіраванне Юдхіштхіры, а значыць і вайна Махабхараты даводзіліся б, мінімум, на 1350 гадоў раней за пачатак каліюгі, што, з пункту гледжання пуран, зусім

бессэнсоўна. З гэтага, у прыватнасці, выходзіць, што паказаны Шак’я не мае, відавочна, адносін да Буды, а таксама да пачатку шака-калы (калі, вядома, мы не маем справу з выпадзеннем шматлікіх пакаленняў падчас наступнага складання пуран).

Апроч сказанага вышэй, існуе шэраг указанняў пуран, якія традыцыйна выкарыстоўваюцца ў храналогіі. Гэта дадзеныя, якія злучаюць кіраванні асобных цароў і рух па зорным небе «сямі рышы» (зорак Вялікай Мядзведзіцы). На ненадзейнасць гэтых дадзеных звярнуў увагу яшчэ Г. Г. Вільсан [8, с. 390–391], таму тут прывядзём толькі адзін прыклад.

Так, пураны паказваюць, што пры нараджэнні ўнука Арджуны Парыкшыта «сем мудрацоў» размяшчаліся ў месяцовым доме Магха (напрыклад, VP IV 24, 105–106), а пры ўзыходжанні на прастол Нандаў – у Пурвашадхе (напрыклад, VP IV 24, 112). Гэта адлегласць складае 9 поўных дамоў. Як вядома, адзін дом сузор’е «праходзіць» за 100 гадоў. Таму паміж Парыкшытам і Махападмай Нанда павінна быць ад 900 да 1100 гадоў (лічачы часткова пачатковы і канчатковы дом). Але гэта не супадае ні з інтэрвалам паміж паказанымі кіраўнікамі па дадзеных пуран, калі скласці ўсе паказаныя кіраванні (каля 1500 гадоў), ні, што яшчэ больш характэрна, з указаннем адпаведнага інтэрвалу самой Вішну-Пуранай – 1500 гадоў (VP IV 24, 104).

Такім чынам, для вызначэння храналогіі Ведаў, якія маюць быць звязаныя з бітвай Махабхараты, індыйская традыцыя дае некалькі адпраўных дат:

1. 3102 г. да н. э. – пачатак каліюгі па Ар’ябхаце.

2. Паміж XXX і XXV стст. да н. э. – пачатак кіравання Юдхіштхіры па Варахаміхіру.

3. XX стст. да н. э. – бітва пры Курукшэтры па царскіх спісах пуран, лічачы ад Ашокі Маур’я.

Відавочнае разыходжанне ў 500–2000 гадоў для вайны Махабхараты з'яўляецца самым слабым месцам прыхільнікаў традыцыйнай індыйскай храналогіі. Яе прыхільнікі часцей за ўсё тлумачаць гэту сітуацыю не толькі ўжо ўзгаданым разначытаннем адносна шака-калы, але і няправільным вызначэннем часу кіравання Ашокі Маур’я. Як вядома, галоўнай падставай для ўсталявання часу кіравання гэтага Ашокі з'яўляюцца надпісы на пракрытах за аўтарствам цара Піядасі (Прыядрасіса), што ўзгадваюць эліністычных кіраўнікоў. Аднак прыхільнікі храналогіі сутр і пуран лічаць гэтым царом не Ашоку Маур’я, а Самудрагупту з дынастыі Гуптаў [напрыклад, 9, с. 71] (у еўрапейскай гістарыяграфіі час кіравання гэтага цара даводзіцца на IV ст. н. э.). А само кіраванне Ашокі Маур’я лакалізуецца ў XV ст. да н. э. Гэтую тэзу досыць цяжка прыняць, паколькі, у гэтым выпадку:

• памыляецца аль-Біруні, які вызначае, на падставе суаднясення з іншымі сістэмамі адліку, пачатак гупта-калы як 320 г. н. э. (Індыя, XLIX);

• палійская Махавамша, чыя XII частка распавядае пра ход распаўсюджання будызму адразу пасля III кангрэса (г. з., па хроніцы,

несумнеўна пры Ашоку Маур’я, праз 18 гадоў яго кіравання), аднаго з прапаведнікаў, імя якога Дхаммаракххіта, заве грэкам (yona) (MV XII, 4), а іншага, імя якога Махаракххіта, адпраўляе прапаведаваць сярод грэкаў (yonaloka) (MV XII, 5) [тут і далей указанні даюцца па 12]). Калі гаворка ідзе пра XV ст. да н. э., то, па-першае, каго маглі назваць грэкам тым часам у даліне Ганга, па-другое, гэта азначае адпраўленне прапаведнікаў далёка на захад – у Эгейскае мора і на Балканы. Але сярод іншых краін, куды накіроўваюцца прапаведнікі, няма ніводнай, якая размяшчалася б на захад ад Гандхары (MV XII, 3–8);

• паводле Махавамшы, сучаснікам Ашокі Маур’я (хай і малодшым), быў Дэванампіяцісса, які ўзышоў на пасад Ланкі ў 236 г. будысцкай эры (эра вылічаецца ад смерці Буды (MV VI, 47)), г. з. праз 18 гадоў пасля інтранізацыі Ашокі, адразу пасля III Кангрэса будыстаў (MV V, 280). Калі гэта XV ст. да н. э., то сама Махавамша сканчае сваё апавяданне ў 835 г. будысцкай эры, г. з. VII ст. да н. э., пасля чаго ў палійскіх хроніках дадзеных няма больш за 1000 гадоў.

Думаецца, што значна меней спрэчным тлумачэннем разыходжання пуран і сутр у датах з'яўляецца фрагментарнасць звестак пуран пры пабудове генеалогій, а менавіта паслядоўнасці дынастый і іх складу. На гэта цалкам пераканаўча паказваюць прыклады з варыянтамі разумення шака-калы і суаднясенні Сіддхартхі з дынастыі Ікшваку з Сіддхартхай Гаутамай. Пра тое ж сведчаць і Г. Г. Вільсан у сваім перакладзе Вішну-Пураны [8, с. 372], і Ф. Э. Паргітэр ва ўжо згаданых заўвагах пра няпоўнасць спісаў кіраўнікоў.

Магчыма таксама, што змены ў прынцыпах выкладання паслядоўнасці кіравання (з'яўленне дакладнага тэрміна кіравання), пачынальна з Бархадратхаў, тлумачыцца не толькі тым, што з гэтай дынастыі пачалося ўзвышэнне Магадхі, але і абгрунтаваннем права цароў гэтай краіны на гегемонію ў Індыі. Для гэтага трэба было «ўпісаць» лінію Бархадратха – Прад’ёна – Шышунага – Нанда (і г. д.) у паслядоўнасць кіравання вялікіх уладароў мінулага па правілах пуран, г. з. пачаць проста ад бітвы пры Курукшэтры. Гэта, фактычна, магло адбывацца як простае аб'яднанне старажытнай традыцыі пуран з мясцовай храналагічнай традыцыяй Магадхі (як гэта рабілася пасля для позніх дынастый), што і прывяло да часавага «правалу».

Такім чынам, варта прызнаць, што дата пачатку каліюгі Ар’ябхаты з'яўляецца найменш спрэчнай, вайна Махабхараты злучана з пачатковым перыядам каліюгі, а значыць, Веды, паводле традыцыйных індыйскіх падыходаў, павінны быць датаваны, ва ўсякім разе, у частцы Рыгведы, перыядам да XXXI ст. да н. э.

У дачыненні да часу, на колькі самі Веды адстаюць ад пачатку каліюгі, у прыхільнікаў традыцыйнага датавання таксама існуюць істотныя рознагалоссі. Чыннікам гэтага зноў з'яўляюцца падставы для падлікаў дат [13, с. 8–20].

Як вядома, удзельнікаў бітвы пры Курукшэтры, Крышну (дынастыя Ядава) і Арджуну (дынастыя Паурава), а таксама Сахадеву (дынастыя Аіла) і Брыхадбалу (дынастыя Айкшваку), пураны лічаць нашчадкамі Ману. Паводле даследаванняў Ф. Э. Паргітэра, усе яны выдаленыя ад першапродка на 94 пакаленні [11, с. 144–149]. Але для Крышны ў пуранах паказана толькі 34 папярэдніка, для Сахадевы – 47, для Арджуны – 52, для Брыхадбалы – 90. Традыцыйныя падлікі даюць і іншыя значэнні: для Крышны – 35 [гл. 14, т. 3, с. 776], для Сахадевы – 36 [гл. 14, т. 3, с. 697], Арджуны – 46 [гл. 14, т. 1, с. 270–271], для Брыхадбалы – 45 ад Ману да Кушы (замест 67) [гл. 14, т. 3, с. 637–638].

Менавіта з-за гэтага, а таксама з-за выбару розных метадаў падліку, і адбываюцца асноўныя адрозненні ў выніках датавання падзей, папярэдніх вайне Махабхараты, а значыць і ў падліках часу існавання рыгведыйскага грамадства.

Разгледзім варыянт датавання Рыгведы па генеалагічных звестках пуран (г. з. асноўны варыянт ў індыйскай традыцыі). Для гэтага возьмем імёны людзей, якія згаданыя ў Рыгведзе, затым па пуранах вызначаем іх дыстанцыю ў пакаленнях ад удзельнікаў бітвы пры Курукшэтры, якую і памнажаем на прыняты інтэрвал.

Такія спісы ўжо не аднаразова складаліся, зразумела, на розных зыходных падставах. Разыходжанні, галоўным чынам, дакранаюцца таго, з каго варта пачынаць адлік складання Рыгведы, і кім яго сканчаць. Існуюць варыянты адліку ад 1-га пакалення да 71 [напрыклад, 15, с. 309– 310], з 3-га да 92-га [напрыклад, 11, с. 300] і г. д. Менавіта ў сілу разначытання і неадназначнай ідэнтыфікацыі існых варыянтаў, мы прапануем свой. Ён адрозніваецца ад ранейшых тым, што разглядаюцца толькі самыя верагодныя сучаснікі стварэння гімнаў. Выключаны імёны прабацькоў і родапачынальнікаў дынастый (паколькі яны і не паказаны як сучаснікі стварэння гімнаў), а таксама імёны рышы і некаторых уладароў, чыя ідэнтыфікацыя сумніўная.

У выніку паказанага адбору, атрымліваем нераўнамернае і не бесперапыннае згадванне кіраўнікоў, якія адносяцца да 20–70 пакаленням розных дынастый па табліцы Ф. Э. Паргітэра.

Разгледзім атрыманыя вынікі з інтэрвалам Паргітэра, а таксама з 20- і 40-гадовым інтэрваламі (да бітвы пры Курукшэтры):

| **Імя** | **Дынастыя** | **№ пакалення** | **Інтэрвал 40 гадоў** | **Інтэрвал 20 гадоў** | **Інтэрвал 12 гадоў (па Ф. Э. Паргітэру)** |
|---|---|---|---|---|---|
| **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** |
| Тамшу | Пуру | 20 | 3000 | 1500 | 900 |
| Мандхатры | Айодх’я | 21 | 2960 | 1480 | 888 |
| Пурукутса | Айодх’я | 22 | 2920 | 1460 | 876 |

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Трасадас’ю | Айодх’я | 23 | 2880 | 1440 | 864 |
| Дзівадаса | Кашы | 25 | 2800 | 1400 | 840 |
| Сагара | Айодх’я | 41 | 2160 | 1080 | 648 |
| Бхарата | Пуру | 44 | 2040 | 1020 | 612 |
| Вітатха | Пуру | 47 | 1920 | 960 | 576 |
| Сухотра | Пуру | 50 | 1800 | 900 | 540 |
| Аджамідха | Пуру | 53 | 1680 | 840 | 504 |
| Рікша | Пуру | 63 | 1280 | 640 | 384 |
| Срінжая | Турвасу | 66 | 1160 | 580 | 348 |
| Судас | Турвасу | 68 | 1080 | 540 | 324 |
| Сахадева | Турвасу | 69 | 1040 | 520 | 312 |
| Самварана | Пуру | 69 | 1040 | 520 | 312 |
| Самака | Турвасу | 70 | 1000 | 500 | 300 |

Вынікі, атрыманыя па методыцы Ф. Э. Паргітэра, паказваюць на складанне Рыгведы ў XIX–XIII стст. да н. э. (ад 950 г. да н. э.) (сам даследчык, як ужо паказвалася, вёў падлік ад Пурураваса да В’ясы, што паказвае на XXI–X стст. да н. э.). Такую храналогію Рыгведы, відавочна, можна лічыць следствам арыентыроўкі, хутчэй, на вядомыя на пачатак XX ст. еўрапейскія даследаванні па гісторыі Старажытнага Ўсходу (першым чынам, хетаў і мітанійцаў), чым на храналогію гісторыі Старажытнай Індыі, якая суадносіцца з указаннямі сутр.

Такім чынам, паводле падыходу да храналогіі, заснаванага на сутрах і пуранах, існаванне рыгведыйскага грамадства трэба адносіць не толькі раней вайны Махабхараты на 500–1000 гадоў, але і раней пачатку каліюгі (3102 г. да н. э.). Гэта выключае XX ст. да н. э. як час вайны Махабхараты, яшчэ раз пацвярджаючы недастатковасць генеалагічных дадзеных пуран для разлікаў паказаных перыядаў.

Адпаведна, пры ўзгодненых указаннях сутр і пуран:

А) вайна Махабхараты адбывалася паміж XXXI і XXVI стст. да н. э.;

Б) рыгведыйскае грамадства існавала, прынамсі, паміж XXXXI і XXXII стст. да н. э.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Müller, F. M.* A History of Ancient Sanskrit Literature / F. M. Müller. – London, 1859. – 627 p.

2. *Елизаренкова, Т. Я.* Ригведа – великое начало индийской литературы и культуры / Т. Я. Елизаренкова // Ригведа. Мандалы I–IV: пер. и коммент. Т. Я. Елизаренковой. – М., 1989. – С. 426–543.

3. *Шилов, Ю. А.* Прародина ариев / Ю. А. Шилов. – Киев, 1995. – 744 с.

4. *Бируни, Абу Рейхан.* Индия / Абу Рейхан Бируни; пер. с араб. А. Б. Халидов, Ю. Н. Завадский. – 2-е изд. – М., 1994. – 727 с.

5. *Халидов, А. Б.* Предисловие / А. Б. Халидов, В. Г. Эрман // Бируни, Абу Рейхан. Индия / Абу Рейхан Бируни; пер. с араб. А. Б. Халидов, Ю. Н. Завадский. – 2-е изд. – М., 1994. – С. 7–53.

6. *Эрман, В. Г.* Комментарии / В. Г. Эрман, А. Б. Халидов // Бируни, Абу Рейхан. Индия / Абу Рейхан Бируни; пер. с араб. А. Б. Халидов, Ю. Н. Завадский. – 2-е изд. – М., 1994. – С. 539–675.

7. Шри Шри Винну-Пурана (оригинальный текст с переводом на хинди); пер. на хинди Шри Мунилал Гупта. – Горакхапур, 1990. – 623 с. с иллюстр.

8. *Wilson, H. H.* Vishnu Purana. A System of Hindu Mythology and Tradition / H. H. Wilson. – Calcutta, 1961. – 562 p.

9. *Narahari Achar, B. N.* Chapter 3. Some Fixed points in the Chronology of BhArata: Examining the astronomical records with Planetarium Software / B. N. Narahari Achar // Astronomical Dating of Events & Select Vignettes from Indian History. Volume I / Edited and compiled by Kosla Vepa. – Pleasanton, Indic Studies Foundation, 2008. – P. 33–97.

10. *Pargiter, F. E.* The purANa Text of the Dynasties of the Kali Age / F. E. Pargiter. – Oxford, 1913. – 97 p.

11. *Pargiter, F. E.* Ancient Indian Historical Tradition / F. E. Pargiter. – London, 1922. – 368 p.

12. MahAvaMsa [Electronic resource] / Ed. Sri Lanka Text Project. – Gretil Text File, 2000. – Mode of access: http://www.sub.uni-goettingen.de/ebene_1/fiindolo/gretil/2_pali/3_chron/mahava_u.htm. – Date of access: 20.11.2010.

13. *Kak, S.* On the Chronological Framework for Indian Culture / S. Kak. – Baton Rouge, 2000. – 26 p.

14. *Parmeshwaranand, S.* Encyclopaedic Dictionary of PurANas / S. Parmeshwaranand. – New Delhi, 2001. – 5 vol.

15. *Frawley, D.* The Rig Veda and the History of India / D. Frawley – New Delhi, 2003. – 364 p.

**(Дата падачы: 20.02.2019 г.)**

*А. В. Петренко*
Витебский государственный университет имени П. М. Машерова, Витебск

*A.V. Piatrenka*
Vitebsk State University named after P. M. Masherov, Bitebsk

**УДК 930.1 (476)**

## ЗАПАДНЫЙ ФРОНТ РОССИЙСКОЙ АРМИИ В 1915–1918 гг.: ИСТОРИОГРАФИЯ ВОПРОСА

## THE WESTERN FRONT OF THE RUSSIAN ARMY IN 1915–1918: HISTORIOGRAPHY OF THE QUESTION

*В статье проанализирована историография о создании, комплектовании и боевой деятельности Западного фронта российской армии в 1915–1918 гг. Выделены три этапа развития историографии и показаны их особенности. Для межвоенного этапа было характерно создание фундаментальных работ непосредственными участниками войны. В этих работах анализировались вопросы тактики, причины стратегических неудач Западного фронта. В советской историографии исследовались преимущественно военно-*